Пролётарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЬНАЯ РАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 276 (345) СУБОТА 30 ЛІСТАПАДА 1940 г.

Цана 10 капеек.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

СТВОРЫМ МАГУТНЫЯ ПРАЦОЎНЫЯ РЭЗЕРВЫ ДЛЯ НАШАЙ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР «Аб дзяржаўных працоўных рэзервах СССР» быў сустрэт усім совецкім народам з вялікім адабрэннем. Аб гэтым сведчыць такі факт: па ўсёй краіне на 601.378 месц у чыгуначныя, рамесленыя вучылішчы і школы ФЗА падана 1.100 тысяч заяў.

Паспяхова прайшоў прызыў па нашай області. Працоўныя вызваленых абласцей добра памятаюць, з якімі цяжкасцямі, з якімі немагчымымі мытарствамі ім прыходзілася пры польскіх уладах набыць сабе кваліфікацыю. Раней чым стаць, напрыклад, ткачом, трэба было некалькі год папрацаваць у саматужніка-ланкетніка, плаціць яму за «навучанне», а вучоба гэта раней усяго заключалася ў тым, што трэба было ўгадзіць ва ўсім і гаспадару і гаспадыні, быць проста хлопчыкам на пабягушках. А для таго, каб трапіць на якую-небудзь фабрыку, трэба было падкупаць і майстра і падмайстра.

Але, нарэшце, малады чалавек набыў сабе кваліфікацыю. Гэта яшчэ не значыць, што ён мае работу. Не толькі малады рабочы, але і старыя, вопытныя ткачы і рабочыя іншых спецыяльнасцей часта хадзілі без работы. Такая была рэчаіснасць у былой панскай Польшчы. Вось чаму працоўныя нашай абласці сустрэлі прызыў з шчырай радасцю. Яны ўпершыню атрымалі магчымасць абучаць сваіх дзяцей любой кваліфікацыі за кошт дзяржавы. Яны таксама ўпэўнены, што іх дзеці пасля тэрміну абучэння будуць забяспечаны работай па спецыяльнасці.

Усяго па нашай абласці трэба было прызваць у вучылішчы і школы ФЗА 1.085 чалавек, заяў было падана 2.539. На прызыўныя пункты бацькі прыходзілі са сваімі дзецьмі і з нецярплівасцю чакалі рашэння камісій. На гродненскі прызыўны пункт рабочы лесазавода тав. Іодэль прышоў са сваімі двума сынамі— Лёнем і Аляксеем. Калі ён даведаўся, што дзеці прыняты ў вучылішча, ён горача падзякаваў членаў прызыўной камісіі. На гэтым-жа прызыўным пункце рабочы Іваноў, даведаўшыся, што яго сына прынялі ў вучылішча, заявіў: «Дзякую нашу партыю і вялікага Сталіна за тое, што яны далі нам і нашым дзецям шчаслівае і радаснае жыццё».

На саколкаўскім прызыўным пункце прыняты ў школу ФЗА тав. Гільбоўскі звярнуўся да членаў прызыўной камісіі з наступнай заявай: «Мой бацька пры польскай уладзе ніколі не меў сталай работы. Мы вечна галадалі, а зараз, пры совецкай уладзе, аб нас, маладых, і аб нашых бацьках сапраўды праяўляюць сталінскія клопаты».

Можна прывесці яшчэ дзесяткі падобных фактаў. Усюды прызыўнікі абяцалі добра вучыцца, быць дысцыплінаванымі, узяць ад вучылішча і школы максімум, што яна можа даць, — гэта значыць стаць кваліфікаванымі рабочымі па сваёй спецыяльнасці.

Партыйныя і совецкія арганізацыі нашай абласці прарабілі велізарную работу па правядзенню прызыву і па падрыхтоўцы да навучальнага года. Пад школы адведзены лепшыя памяшканні, падабраны неабходныя кадры кіраўнікоў і майстраў, падрыхтаваны інтэрнаты і сталовыя. Усё гэта забяспечвае паспяховае правядзенне заняткаў. Трэба, аднак, адзначыць, што не ўсюды па-большэвіцку зразумелі значэнне Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета аб стварэнні працоўных рэзерваў. Некаторыя гаспадарнікі пачыноўніцку, па дзяляцку аднесліся да гэтай важнейшай задачы. Гэта асабліва адносіцца да начальніка Беластоцкай чыгункі тав. Бадунова. Тут яшчэ не ў поўным парадку інтэрнат, яшчэ не абсталявана сталовая для чыгуначнага вучылішча. І ёсць пагроза, што першыя дні заняткаў будуць праходзіць пры значных тормазах. Такому непартыйнаму, недзяржаўнаму падыходу да сур'ёзнай справы трэба пакласці канец. Кіраўніцтва чыгункі, палітаддзел і партыйныя арганізацыі павінны зрабіць усё неабходнае, каб неадкладна забяспечыць нармальныя заняткі ў чыгуначным вучылішчы.

Увага, якая ўдзялялася партыйнымі, совецкімі, комсамольскімі арганізацыямі па правядзенню прызыву і падрыхтоўцы да пачатку вучэбнага года, не толькі не павінна зараз аслабляцца, а павінна быць у многа разоў узмоцнена. Трэба, каб партыйныя, совецкія, комсамольскія арганізацыі з першых дзён заняткаў унікалі глыбока ў жыццё вучылішчаў і школ ФЗА, каб яны да самых дробязей ведалі, што робіцца ў школах, у чым яны адчуваюць патрэбу, і своечасова аказвалі ім адпаведную дапамогу.

У вучылішчах і школах павінен быць узорны парадак, узорная дысцыпліна. Гэта трэба настойліва і ўпорна прывіваць вучням. У гэтым вялікая доля работы падае на комсамол, які павінен разгарнуць у школах вялікую палітыка-выхаваўчую работу з першых-жа дзён заняткаў.

Сотні тысяч юнакоў совецкай краіны прыступаюць да вялікай, адказнай работы. Яны будуць арганізаваным парадкам папаўняць рады рабочага класа. Зробім усё неабходнае, каб юнакі пасля скапчэння тэрміну абучэння прыйшлі на прадпрыемствы кваліфікаванымі, высокадысцыплінаванымі і культурнымі людзьмі.



Група прызыўнікоў, прыбыўшыя з Сапоцкінскага раёна ў Гродненскае рамесленае вучылішча. Фота А. Сапіра.

Напярэдадні вучэбнага года ў рамесленых, чыгуначных вучылішчах і школах ФЗА

★ ★

Прыезд прызыўнікоў у Гродненскае вучылішча

ГРОДНА. **(Па тэлефону ад нашага карэспандэнта).** Вялікая зала сталовай рамесленага вучылішча ўстаўлена двума радамі сталоў, якія засцелены беласнежнымі абрусамі. На сталах—талеркі, вілкі, нажы, лыжкі. Афіцыянткі з нецярплівасцю чакаюць гасцей — вучняў рамесленага вучылішча. Хутка памяшканне сталовай запаўняюць жыццерадасныя юнакі.

Вучні займаюць месцы за сталамі. Афіцыянткі разносяць сытныя, смачныя абеды.

28 лістапада ў Гродненскае рамесленае вучылішча з раёнаў пачалі прыбываць прызваныя вучні. На вакзале іх сустракалі дзяжурныя комсамольцы, усаджвалі прыбыўшых на аўтамашыну і накіроўвалі ў лазню. Памыўшыся чыста, вучні накіроўваліся ў сталовую, а затым — у інтэрнат.

Першая група вучняў у 30 чалавек прыбыла з Аўгустоўскага раёна. Многія з прыбыўшых — дзеці калгаснікаў. Яны ўлетку дружна працавалі на калгасных палях. Прыехалі сябры Іван Мядзведскі і Іосіф Данішэўскі з калгаса імені Сталіна, Усцянскага сельсовета. Па-ўдарнаму яны працавалі ў калгасе. У кожнага з іх у працоўнай кніжцы запісана больш чым па 200 працадзён, а зараз яны будуць набываць кваліфікацыі.

— Мы ўважліва будзем слухаць выкладчыкаў, майстраў. Будзем старанна рыхтаваць урокі, каб выйсці са школы добрымі спецыялістамі сваёй справы. Закончыўшы школу, мы адплоцім радзіме стаханаўскай работай на вытворчасці,—гавораць Мядзведскі і Данішэўскі.

З калгаса «Парыжская Комуна», Гродненскага раёна, прыехаў на вучобу Леон Валько. Старэйшы брат яго працуе ў калгасе кавалём. Не раз Леня любаваўся работай свайго брата. Яму таксама хацелася мець справу з металам і рабіць з яго карысныя рэчы. Лёня вучыўся ў 5-м класе няпоўнай сярэдняй школы. Прачытаўшы Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб працоўных рэзервах, ён цвёрда рашыў пайсці вучыцца ў новую школу і набыць кваліфікацыю слесара.

У школу прыбыла ўжо 90 чалавек. Ва ўсіх радасны, бадзёры настрой. Кожны з іх чакае пачатку заняткаў.

ПРОВАДЫ ПРЫЗЫЎНІКОЎ

Моладзь Скідэльскага раёна, прызваная ў Гродненскае рамесленае вучылішча, з нецярпеннем чакала адпраўкі. 27 лістапада з прызыўнікамі правёдзіў гутарку старшыня райвыканкома аб прадстаячай вучобе ў рамесленым вучылішчы. Гутарка выклікала многа пытанняў.

Сёння раніцой будуць наладжаны провады.

* * *

Напярэдадні адпраўкі прызыўнікоў у Саколкаўскую школу ФЗА ў дамброўскім клубе будзе праведзен вечар, на якім будзе дадзен канцэрт мастацкай самадзейнасці.

Моладзь Дамброва рыхтуецца да ўрачыстай адпраўкі прызыўнікоў у школу ФЗА.

* * *

27 лістапада ў памяшканні Граеўскага райвыканкома сабраліся для ад'езду ў саколкаўскую школу ФЗА будаўнікоў 25 юнакоў, прынятых у школу.

28-га раніцой вучняў праводзілі ў школу ФЗА. Для провадаў разам з вучнямі выехаў загадчык аддзела кадраў райвыканкома.

Рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты Беластоцкага гарадского Совета дэпутатаў працоўных

101. Па акрузе **№ 59** зарэгістраваан Лейб Беніямінавіч **Прыпштэйн,** 1905 года нараджэння, беспартыйны, памочнік майстра пякарні № 6, вылучаны калектывам хлебакамбіната.

102. Па акрузе **№ 60** зарэгістраваан Якаў Шаевіч **Паразоўскі,** 1921 года нараджэння, член ВЛКСМ, ткач тэкстыльнай фабрыкі № 17, вылучаны калектывам гэтай фабрыкі.

103. Па акрузе **№ 62** зарэгістравана Лідзія Феліксаўна **Барсук,** 1911 года нараджэння, беспартыйная, зменны майстар тэкстыльнай фабрыкі № 17, вылучаная калектывам рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых фабрыкі № 17.

104. Па акрузе **№ 65** зарэгістраваан Мордухай Сямёнавіч **Кіслік,** 1907 года нараджэння, член ВКП(б), дырэктар Горхарчпромгандлю, вылучаны калектывам работнікаў гандлю г. Беластока.

105. Па акрузе **№ 68** зарэгістраваан Казімір Рамуальдавіч **Легомскі,** 1903 года нараджэння, беспартыйны, машыніст электрастанцыі, вылучаны калектывам электрастанцыі.

106. Па акрузе **№ 70** зарэгістравана Марыя Канстанцінаўна **Пятроўская,** 1902 года нараджэння, беспартыйная, намеснік старшыні горвыканкома, вылучаная калектывам работнікаў тэкстыльнага камбіната № 1.

107. Па акрузе **№ 75** зарэгістравана Альбіна Адамаўна **Федасюк,** 1904 года нараджэння, беспартыйная, сакратчыца прадзільнага цэха тэкстыльнага камбіната № 1, вылучаная калектывам рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых гэтага-ж камбіната.

108. Па акрузе **№ 77** зарэгістраваан Цімафей Кузьміч **Нефедаў,** 1901 года нараджэння, член ВКП(б), загадчык гарадского фінансавага аддзела, вылучаны калектывам работнікаў табачнай фабрыкі.

109. Па акрузе **№ 78** зарэгістраваан Алойзы Янавіч **Сакольскі,** 1888 года нараджэння, беспартыйны, сукнавал тэкстыльнага камбіната № 2, вылучаны калектывам гэтага-ж камбіната.

110. Па акрузе **№ 79** зарэгістравана Фёкла Іванаўна **Саўчук,** 1896 года нараджэння, беспартыйная, ватазагоншчыца тэкстыльнай фабрыкі № 12, вылучаная калектывам рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых фабрыкі № 12.

111. Па акрузе **№ 81** зарэгістравана Вікторыя Антонаўна **Бакс,** 1891 года нараджэння, беспартыйная, матальшчыца тэкстыльнай фабрыкі № 16, вылучаная калектывам гэтай-жа фабрыкі.

112. Па акрузе **№ 84** зарэгістраваан Зігмунд Паўлавіч **Мазурык,** 1905 года нараджэння, беспартыйны, машыніст тэкстыльнай фабрыкі № 23.

113. Па акрузе **№ 85** зарэгістраваан Меер Майсеевіч **Ханін,** 1902 года нараджэння, беспартыйны, ткач тэкстыльнай фабрыкі № 23, вылучаны калектывам фабрыкі № 23.

114. Па акрузе **№ 86** зарэгістравана Анна Пракоф'еўна **Савельева,** 1900 года нараджэння, беспартыйная, работніца ватнай фабрыкі № 23, вылучаная калектывам гэтай-жа фабрыкі.

115. Па акрузе **№ 90** зарэгістраваан Сяргей Іванавіч **Мальцаў,** 1895 года нараджэння, член ВКП(б), старшыня Беластоцкага аблвыканкома, вылучаны калектывам работнікаў тэкстыльнага камбіната № 13.

116. Па акрузе **№ 91** зарэгістраваан Фелікс Станіслававіч **Льорэк,** 1903 года нараджэння, беспартыйны, агент снабжэння цвіковага завода № 1, вылучаны калектывам гэтага-ж завода.

117. Па акрузе **№ 92** зарэгістраваан Грыгорый Іванавіч **Дружынін,** 1903 года нараджэння, член ВКП(б), начальнік гораддзела міліцыі, вылучаны калектывам тэкстыльнай фабрыкі № 29.

118. Па акрузе **№ 93** зарэгістраваан Франц Вінцэнтавіч **Куява,** 1892 года нараджэння, беспартыйны, рабочы маслабойнага завода № 2, вылучаны калектывам маслабойнага завода № 2.

119. Па акрузе **№ 96** зарэгістраваан Аляксандр Васільевіч **Лашук,** 1901 года нараджэння, член ВКП(б), галоўны інжынер электрастанцыі г. Беластока, вылучаны калектывам электрастанцыі.

120. Па акрузе **№ 97** зарэгістраваан Андрэй Майсеевіч **Данілюк,** 1895 года нараджэння, беспартыйны, старшы качагар электрастанцыі, вылучаны калектывам работнікаў электрастанцыі.

Сустрэчы выбаршчыкаў з кандыдатамі

Адбылася сустрэча выбаршчыкаў з кандыдатам у Кольнаўскі раённы Совет дэпутатаў працоўных, сакратаром райкома партыі тав. Адамейка. У памяшканні Ставіскоўскай няпоўнай сярэдняй школы, дзе адбывалася сустрэча, сабралося каля 300 чалавек працоўных.

У памяшканні Ломжынскага тэатра адбылася сустрэча выбаршчыкаў з кандыдатамі ў дэпутаты гарадского Совета тт. Івановым—упраўляючым Ломжынскага банка і т. Рэмішэўскім—машыністам электрастанцыі.

Сустрэчы праходзяць пры вялікай актыўнасці выбаршчыкаў.

П. Грышчанка.

ПАМЯЦІ С. М. КІРАВА

У беластоцкім Доме партыйнай асветы адкрылася выстаўка кніг і фотаздымкаў, прысвечаная памяці Сергея Міронавіча Кірава.

Сярод кніг знаходзяцца «Хлопчык з Уржума» А. Голубевай — аповесць пра дзіцячыя і юнацкія годы Кірава, зборнікі яго артыкулаў і прамоў, біяграфічныя нарысы.

Фотавыстаўка адлюстроўвае жыццёвы шлях Кірава ад Уржумскага дома прытулку да смерці ад подлай здрадніцкай рукі трацкісцка-бухарынскіх вырадкаў.

Асаблівую цікавасць выклікаюць здымкі падпольнай друкарні, абсталяванай пад кіраўніцтвам тав. Кірава ў Томску, сакрэтнага корпуса Томскай турмы, куды Кіраў быў заключан і т. д.

* * *

У Доме партыйнай асветы адбыўся інструктыўны даклад аб жыцці і дзейнасці Кірава.

На прадпрыемствах, установах і выбарчых участках праводзяцца гутаркі і даклады аб палкім змагару за справу комунізма тав. Кіраве.

* * *

КІРАЎСК, 28 лістапада. (ТАСС). У сувязі з шостай гадавінай з дня зладзейскага забойства С. М. Кірава на прадпрыемствах, ва ўстановах праводзяцца гутаркі і лекцыі аб жыцці і дзейнасці С. М. Кірава. Многія работнікі тут асабіста ведалі Сергея Міронавіча, гутарылі з ім у час яго прыезду ў Запаляр'е. З вялікай любоўю яны ўспамінаюць абаяльны вобраз палкага рэволюцыянера — большэвіка.

Ля падножжа апатытавай гары Кукісвумчор стаіць маленькі стандартны домік, цяпер музей Кірава. Тут 11 год назад Сергей Міронавіч разам з геолагамі распрацоўваў план будаўніцтва буйнейшага ў свеце апатытавага рудніка. У тундры вырас горад, які носіць імя Кірава.

30 лістапада ў гарадскім тэатры і клубах адбудуцца жалобныя вечары, прысвечаныя памяці С. М. Кірава.

* * *

Лекцыі, даклады і гутаркі аб Кіраве праводзяцца ў часцях Кіеўскай асобай ваеннай акругі, у Варашылаўску, Якуцку, Кіравабадзе, Сталінску і іншых гарадах і сёлах Совецкага Саюза. У акруговым доме партыйнай прапаганды Кіеўскай асобай ваеннай акругі арганізавана выстаўка. Фатаграфіі, дакументы і літаратура, экспаніраваныя на выстаўцы рысуюць баявую дзейнасць С. М. Кірава ў годы грамадзянскай вайны. У Варашылаўску арганізуюцца экскурсіі працоўных па кіраўскіх месцах. У Пяцігорску адкрываецца манументальны помнік Сергею Міронавічу Кіраву. Вышыня яго — 11 метраў.

Па Совецкай краіне

VII УСЕСАЮЗНЫЯ ХІМІЧНЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ

Падведзены вынікі хімічных спаборніцтваў, адбываўшыхся з 1 ліпеня па 1 лістапада 1940 года ў раёнах, абласцях, краях, аўтаномных і саюзных рэспубліках.

У раённых хімічных спаборніцтвах прыняло ўдзел 306.888 пярвічных арганізацый Асоавіяхіма — звыш 6.200 тысяч чалавек. Пяршынства ў абласных, краявых і рэспубліканскіх хімічных спаборніцтвах аспрэчвалі 2.530 пярвічных арганізацый таварыства. У дні спаборніцтваў толькі ў двух рэспубліках — РСФСР і Грузінскай ССР — створана 1.560 пярвічных арганізацый Асоавіяхіма. За апошнія пяць месяцаў 1940 года 1.120 тысяч працоўных здалі нормы на значок «Гатоў да проціпаветранай і проціхімічнай абароны».

136 пярвічных арганізацый таварыства зацверджаны ўдзельнікамі VII усесаюзных хімічных спаборніцтваў, якія будуць праходзіць з 1 па 15 снежня. (ТАСС).



Ерэванскі Дзяржаўны ордэна Леніна тэатр оперы і балета імені А. А. Спендырава (Армянская ССР), пабудаваны па праекту акадэміка архітэктуры Таманяна.
Фота В. Егорава. Фота ТАСС.

ГІДРАЎЛІЧНЫ МАТРЫЧНЫ ПРЭС

Рыбінскі завод паліграфічнага машынабудаўніцтва выпусціў гідраўлічны прэс, прызначаемы для ціснення з друкарскага набору картонных і свінцовых матрыц. Прэс дазваляе поўнасцю аўтаматызіраваць ціснение матрыц. Якасць іх значна паляпшаецца, паскараецца вытворчы працэс у друкарнях.

(ТАСС).

РЭКОРД ЗАБОЙШЧЫКА ЯБЛОНСКАГА

НЕЎЯНСК. Забойшчык рудніка «Серадавіна», Неўянскага прыіска Яблонскі ўстанавіў усесаюзны рэкорд здабычы залатой руды. Ручным перфаратарам ён абурыў 5 забояў, выканаўшы норму па праходцы на 800 процантаў. За змену тав. Яблонскі зарабіў 550 рублёў.

НА ЛОЎЛЮ СЕЛЯДЦОЎ У ПАЎДНЁВЫМ КАСПІІ

АСТРАХАНЬ. З Астрахані 27 лістапада вышлі апошнія 65 рыбацкіх суднаў, якія ўдзельнічаюць у экспедыцыі, накіроўваючайся на лоўлю селядцоў у Паўднёвым Каспіі. У саставе экспедыцыі —больш 200 суднаў і 2.500 рыбакоў Азербайджана, Туркменіі і Волга-Каспійскага рыбтрэста.

МІНІЯТУРНАЕ ПІЯНІНА

Кіеўскі музыкальны кабінет прыступіў да серыйнага выпуску мініятурных піяніна — так званых «міні-піяніна».

Новы інструмент знойдзе прымяненне ў музыкальных школах.

Камісія спецыялістаў зрабіла экспертызу «міні-піяніна» і дала ім добрую ацэнку. (ТАСС).

КАНДЫДАТЫ Ў ДЭПУТАТЫ АБЛАСНОГА СОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

Выбаршчыкі Бакімскай выбарчай акругі № 70, Лапскага раёна! 15 снежня ўсе як адзін аддавайце свае галасы за Войцэха Грыгор'евіча ІЧКОЎСКАГА!

* * *

Войцэх Грыгор'евіч Ічкоўскі

(*БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС*).


Войцэх Грыгор'евіч Ічкоўскі—самы старэйшы з вылучаных кандыдатаў у дэпутаты Беластоцкага абласнога Совета. Ён нарадзіўся ў 1870 годзе ў вёсцы Крапіўніца, цяпер Лапскага раёна. Бацька яго меў толькі тры гектары зямлі. Беспрасветным і забітым было яго жыццё. З вялікімі цяжкасцямі Войцэху ўдалося скончыць тры класы пачатковай школы. Потым ён пайшоў служыць да кулакоў.

У 1892 годзе Войцэха Ічкоўскага прызвалі на службу ў царскую армію. Служба гэта цягнулася каля 4-х год, і Войцэх Ічкоўскі выслужыў званне ўнтэр-афіцэра. Аднак гэты чын не радаваў яго. Як толькі тэрмін службы скончыўся, ён вярнуўся ў сваю вёску, каб як-небудзь завесці сваю гаспадарку. Але гэтай мары не суджана было ажыццявіцца. Войцэх шукае выхаду з цяжкага становішча, але яго няма. Ідзе ў прымакі ў вёску Новая Кавалеўшчына, працуе некаторы час у гаспадаркі цесця, а потым паступае вартаўніком на масейную дарогу, дзе працуе 17 год.

Калі пачалася імперыялістычная вайна 1914 года, яго прызываюць у армію. Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя 1917 года застае яго рабочым на млыне ў Паўлаградзе, былой Екацярынаслаўскай губерні. Ён горача ўспрымае рэволюцыю.

Совецкая ўлада надзяляла малазямельных і беззямельных сялян зямлёй. І Войцэх Ічкоўскі, як толькі стала магчыма, спяшаецца на радзіму, да сваёй сям'і, каб тут атрымаць зямлю і, нарэшце, зажыць па-чалавечаму. Сяляне вёскі выбіраюць яго членам сялянскага камітэта. У камітэце Ічкоўскі энергічна бярэцца за справу. Ён праводзіць канфіскацыю памешчыцкай зямлі, маёмасці, якую размяркоўвае паміж батракамі і беднякамі.

Але тады маладая, яшчэ не акрэпшая совецкая ўлада не ўтрымалася на радзіме Ічкоўскага. Чырвоная Армія адступіла. Пасля гэтага Войцэх два тыдні блукаў па лясах. На донцы паліцыянт яго пытаў:



— У большэвіцкім камітэце быў?

— Быў!—адказаў Ічкоўскі.

— Чужое дабро браў?

Войцэх раптам пабляднеў. Злосць хлынула да сэрца.

— Як вы смееце так гаварыць!? Я канфіскаваў у памешчыкаў і кулакоў зямлю і маёмасць згодна закона, канфіскаваў тое, што яны награбілі ў народа!

Паліцыянт зморшчыўся. Адказ Войцэха прышоўся яму не па густу.

— Большэвік!—працадзіў паліцыянт праз зубы...

Доўга Войцэх шукае сабе работы. Нідзе яго не прымаюць. На сельскай гаспадарцы яму прыжыць вельмі цяжка. Нарэшце, яго прымаюць вартаўніком на тую-ж самую шасейную дарогу. На гэты раз на дарозе ён працуе 8 год, а потым яго звальняюць па старасці.

Войцэх абівае парогі розных ведамстваў польскай дзяржавы, просіць, каб аказалі дапамогу па старасці, але яму адмаўляюць.

З верасня 1939 года для Войцэха Грыгор'евіча Ічкоўскага пачалося новае жыццё, як і для ўсіх працоўных вызваленых абласцей. Ён нібы ў другі раз нарадзіўся на свет. Не гледзячы на свае 70 год, ён актыўна ўключыўся ў будаўніцтва новага соцыялістычнага жыцця. Спачатку працуе ў сялянскім камітэце, потым яго выбіраюць старшынёй лупянскага сельпо. У лупянскае сельпо ўваходзяць чатыры магазіны. 70-гадовы старшыня сельпо нястомна клапоціцца, кабва ўсіх магазінах былі тавары, каб лепш абслужыць совецкага спажыўца.

Працоўныя цэняць чэсную працу людзей. За чэсную працу, за адданасць соцыялістычнай радзіме сяляне вёскі Новая Кавалеўшчына і вылучылі Войцэха Грыгор'евіча Ічкоўскага кандыдатам у дэпутаты Беластоцкага абласнога Совета па Бакімскай выбарчай акрузе № 70. Войцэх з радасцю прыняў вялікае давер'е народа.

— Давер'е выбаршчыкаў я апраўдаю,—гаворыць тав. Ічкоўскі.—Буду чэсна змагацца за інтарэсы народа. Толькі цяпер народ можа жыць свабодна і шчасліва, выбіраць у органы ўлады тых людзей, якіх ён жадае, якім давярае. Свабоду і шчасце нам дала Сталінская Канстытуцыя, правадыр усіх народаў таварыш Сталін. Мне ўжо 70 год. Але я яшчэ адчуваю сябе, як малады. Мне хочацца працаваць і працаваць на дабро і карысць нашай радзімы.

Выбаршчыкі Бакімскай выбарчай акругі № 70 аднадушна аддадуць свае галасы за кандыдата сталінскага блока комуністаў і беспартыйных Войцэха Грыгор'евіча Ічкоўскага, простага, сумленнага чалавека.

П. Дук.

Выбаршчыкі Міхайлаўскай выбарчай акругі № 54, Заблудаўскага раёна! 15 снежня ўсе як адзін аддавайце свае галасы за Сяргея Міхайлавіча КАРТАШОВА!

* * *

Сяргей Міхайлавіч Карташоў

(*БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС*).

Ён прайшоў цяжкі шлях жыцця. Нарадзіўся у 1895 годзе ў горадзе Сімбірску (зараз горад Ульянаўск, Куйбышэўскай вобласці) у сям'і краўца-саматужніка. Заработак бацькі быў такі, што не хапала на пракармленне сям'і з 6 чалавек.

— Жылося вельмі цяжка, — расказвае Сяргей Міхайлавіч.

Яшчэ стала цяжэй пасля смерці бацькоў. Тады Сяргею было 12 год. Ён вымушан ісці самастойна зарабляць сабе на хлеб. Але куды ісці, дзе знайсці работу? Ён паступае на Екацерынаўскую фабрыку. Працуе на розных работах. Быў сартыроўшчыкам воўны, прысучальшчыкам у прадзільным аддзеле, мыў воўну. Зарабляў па 48 капеек у тыдзень. Гэта было ў 1908 годзе.

Праз некаторы час яму пашчасцілася папасці ў механічную майстэрню і набыць кваліфікацыю токара па металу. Пачаў зарабляць па 11 рублёў 50 капеек у месяц.

У маленстве Сяргей Міхайлавіч вучыцца не меў магчымасці. Яму з вялікімі цяжкасцямі ўдалося скончыць сельскую школу. За тры кілометры прыходзілася хадзіць у гэтую школу.

У 1912 годзе на фабрыцы ўспыхнула забастоўка. Жорстка расправілася царская паліцыя з забастоўшчыкамі. Многія рабочыя былі звольнены. Прагналі з фабрыкі і малалога Сяргея. Ён бярэ на плечы торбу і накіроўваецца шукаць работу на іншых фабрыках. Але яго нідзе не прымаюць. Два месяцы хадзіў Сяргей з фабрыкі на фабрыку, кланяўся гаспадарам. Усюды чуў адзін адказ: «Няма работы». Звярнуўся зноў да старога гаспадара. Шэсць дзён упрашваў, каб прыняў на работу.

— Прыходзь працаваць, — сказаў, нарэшце, гаспадар.

На гэтай фабрыцы Сяргей Карташоў працаваў да 1915 года. У гэтым-жа годзе ён быў мабілізаван у царскую армію. Праслужыў тры годы. У сакавіку 1918 года, прышоўшы з арміі, ён вылучаецца ў камісію па нацыяналізацыі прадпрыемстваў. Рабочыя вылучаюць



тав. Карташова таксама ў камісію контролю над вытворчасцю.

У лістападзе 1918 года быў прызван у Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію. Яго назначаюць камісарам аўтабронетанкавых майстэрань. У 1921 годзе яго адкамандыроўваюць з Чырвонай Арміі на гаспадарчую работу. Назначаюць памочнікам дырэктара суконнай фабрыкі ў Барышэўскім раёне, Куйбышэўскай вобласці. З гэтага года тав. Карташоў увесь час працуе на кіруючай гаспадарчай рабоце.

Будучы ў Чырвонай Арміі ў 1919 годзе, ён уступае ў члены большэвіцкай партыі. Неаднаразова быў выбіраецца ў партыйныя органы. Быў членам пленума Кузнецкага акругового камітэта ВКП(б). У 1932 годзе быў выбран членам Сярэдне-Волжскага краявога камітэта партыі.

Да 1930 года тав. Карташоў працаваў дырэктарам на шэсці тэкстыльных фабрыках. Паўтара годы працаваў намеснікам дырэктара Ўсесаюзнага аб'яднання «Саюзпагошэрсць». Пасля гэтага яго назначаюць дырэктарам фабрыкі «Пролетарская победа», пад Масквой, дзе працуе два годы.

Затым тав. Карташова накіроўваюць на вучобу. Праву чыўшыся тры годы на асобым факультэце Промакадэміі, ён затрымлена адкліжаецца з вучобы: яго пасылаюць зноў на кіруючую гаспадарчую работу.

На ўсіх участках работы, куды яго пасылала партыя, усюды ён з чэсцю выконваў даручаную яму справу.

Да прыезду ў Беласток тав. Карташоў працаваў дырэктарам будаўніцтва бавоўняна-прадзільнай фабрыкі ў Люберцаху.

5 снежня 1939 года яго назначаюць упраўляючым Беластоцкага тэкстыльнага трэста. Тут тав. Карташоў пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі правёў велізарную работу па рэканструкцыі і аднаўленню тэкстыльнай прамысловасці.

Свой шматгадовы вопыт работы на тэкстыльных прадпрыемствах тав. Карташоў перадае тэкстыльшчыкам Беластока. На камбінатах шырока разгортваецца стаханаўскі рух. Беластоцкія тэкстыльныя фабрыкі дадуць у гэтым годзе сукна ў два разы больш, чым выраблялі гэтыя фабрыкі пры капіталістах.

Тэкстыльшчыкі Беластока ведаюць тав. Карташова як адданага работніка, добрага кіраўніка і гаспадарніка.

... Рабочыя Міхайлаўскага камбіната сабраліся на сход, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты абласнога Совета дэпутатаў працоўных. Першай была названа кандыдатура тав. Карташова. Гэта прапанова падтрымана на шматлікіх сходах. Сяргей Міхайлавіч Карташоў дастоін быць дэпутатам абласнога Совета дэпутатаў працоўных.

Г. Скуцэня.

Кандыдаты ў дэпутаты Беластоцкага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных

Франц Вінцэнтавіч Куява

Франц Куява—гэта адзін з актыўнейшых удзельнікаў рэволюцыйнага руху ў былой Польшчы. Усё яго жыццё—адважная, бязлітасная барацьба з ненавісным капіталістычным ладам.

Тав. Куява нарадзіўся ў 1892 годзе ў вёсцы Цэдровец, Лодзінскага ваяводства. Дзяцінства сваё праводзіць у Азаркове, дзе яго бацькі працуюць на фабрыцы Шлёсароўскай мануфактуры. Школа не была даступна для дзяцей беднага рабочага, і Куява толькі дарослым ужо навучыўся чытаць і пісаць.

У час рэволюцыі 1905 года 13-гадовы Франц Куява прымае ўдзел у дэманстрацыі разам са сваім бацькам і братам.

Пасля смерці бацькі ў 1906 годзе Куява пачаў працаваць ткачом у Шлёсароўскай мануфактуры ў Азаркове. Пасля чатырох год работы яго зволілі. Потым ён працаваў на розных тэкстыльных фабрыках у Лодзі, дзе пазнаёміўся з рабочым рухам. У 1912 годзе ён вярнуўся ў Азаркоў, дзе працуе ткачом і вядзе рэволюцыйную дзейнасць, арганізоўвае ў 1914 годзе забастоўку, якая працягвалася 6 тыдняў.

У 1917 годзе тав. Куява ўступае ў соцыял-дэмакратычную партыю Польшчы і Літвы, у 1918 годзе—у КПП. У гэтым-жа годзе Куява прымае актыўны ўдзел у арганізацыі Совета рабочых і сялянскіх дэпутатаў у Азаркове. Пасля падаўлення рэволюцыйнага руху польскай буржуазіяй тав. Куява быў арыштаван, але яму ўдалося ўцячы, і партыя накіравала яго на партыйную работу ў Варшаву.

У час польскай вайны супроць Совецкай Расіі тав. Куява арганізоўвае дэманстрацыю пратэсту рабочых у Азаркове і мабілізаваных салдат на вуліцах Ленчыцы.

У 1921 годзе перад 1 мая тав. Куява быў арыштаван разам з іншымі таварышамі. Абураныя рабочыя Азаркова пасля скончэння работы на фабрыцы атакавалі паліцэйскі пост, спрабуючы адбіць арыштаваных.

Пасля года следства тав. Куява быў асуджан на 4 годы турмы з пазбаўленнем правоў на 10 год, а за вывешванне чырвонага сцяга з турмы ў гадавіну Кастрычніцкай рэволюцыі яму дадатакова асудзілі яшчэ на адзін год турэмнага зняволення.

Пасля выхаду з турмы ў 1928 годзе ён прымае ўдзел у кіраўніцтве агульнай забастоўкай у Лодзі, арганізоўвае дэманстрацыю, якую кіраўнікі ППС разганяюць пры дапамозе паліцыі.

На даручэнню партыі тав. Куява едзе ў Дамброўскі вугальны басейн. У 1931 годзе яго зноў арыштоўваюць і асуджаюць на 4 годы турмы з пазбаўленнем правоў на 10 год.

Доўгія годы турмы і галадоўкі, працягваючыхся па 8 дзён, падарвалі здароўе тав. Куявы, але не зламалі яго дух. Пасля выхаду з турмы, у 1935 годзе, ён працуе ў профсаюзах у якасці сакратара і інструктара. Вядзе барацьбу з польскай буржуазіяй. Напярэдадні польска-нямецкай вайны ён адважна выступае ў Азаркове супроць шавіністычнай кампаніі ў адносінах да нямецкіх рабочых, якіх выкідвалі з фабрык.

Калі Чырвоная Армія вызваліла Заходнюю Беларусь, тав. Куява прышоў у Беласток, каб жыць пад сцягам свабоды, за якую змагаўся многа год. Працуючы на Беластоцкім масларобным заводзе, тав. Куява паказвае прыклады ўзорнай работы. За добрую работу ён атрымаў прэмію, а яго грамадскую актыўнасць ацаніў рабочы калектыў, вылучыўшы яго кандыдатуру ў дэпутаты Беластоцкага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных.

Тав. Куява апраўдае давер'е выбаршчыкаў. Ён будзе дастойным прадстаўніком працоўных.

Б. Джэвецкі.

Ісак Файвелевіч Фукс

Калектыў паліграфічнага камбіната «Беластокдрук» вылучыў кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета па 224 выбарчай акрузе рабочага-наборшчыка Ісака Файвелевіча Фукса.

Тав. Фукс з'яўляецца на прадпрыемстве адным з лепшых грамадскіх працаўнікоў і заслужана карыстаецца аўтарытэтам сярод рабочых. Былы палітзняволены тав. Фукс пасля вызвалення яго з турмы прыбыў у Беласток, уключыўся ў актыўную грамадскую работу. Вылучаючыся сваёй скромнасцю, таварыскімі адносінамі, ён у хуткім часе заваяваў сярод рабочых папулярнасць, і яго выбралі членам фабкома і старшынёй культкамісіі.

Жыццёвы шлях Ісака Файвелевіча Фукса — гэта шлях свядомага рабочага, які звязаў сваё жыццё з рэволюцыйным рухам. Рабочыя «Беластокдруку» не раз чулі яго біяграфію. Нарадзіўся ён у 1899 годзе ў сям'і рамесніка у г. Чэнстахова. Скончыўшы гарадское вучылішча, 14-гадовы Ісак вымушан шукаць сабе работы. Працуе ў буйным прамысловым горадзе Лодзі, затым—у Варшаве, дзе прымае ўдзел у рэволюцыйным руху. У 1917 годзе ён уступае ў чырвоную фракцыю профтаварыства гандлёвых рабочых у Варшаве. У 1918 годзе ўступае ў комуністычную партыю.

У 1934—35 годзе ён працуе кіраўніком акругавага камітэта МОПР'а у Кракаве і ў Любліне. Потым яго арыштоўваюць. Пяць месяцаў ён праводзіць у канцэнтрацыйных лагерах Картуз-Бярозы.

Верасень 1939 года застае тав. Фукса ў турме. Разам з іншымі палітзняволенымі ён вырываецца з турмы на волю і ідзе насустрач Чырвонай Арміі.

Рабочыя «Беластокдруку» упэўнены, што Ісак Файвелевіч Фукс апраўдае іх давер'е, будзе чэсна працаваць на карысць народа.

Л. Райскі.

Лесазагатоўкі і лесавывазкі

ЖАНЧЫНЫ--ЛЕСАРУБЫ

Далёка па лесу разносіцца стук тапароў, звон піл, чалавечых галасоў. На вялікай вырубленай плошчы вырaслі ярусы будаўнічых лесаматэрыялаў, дроў. Гэта лесанарыхтоўкі Крынічная, Гродненскага лесапрамгаса. Больш месяца таму назад да начальніка ўчастка прышла маладая жанчына.

— Ці не знойдзецца для мяне якая-небудзь работа ў вас?—бязвільна запытала яна.

Начальнік участка, абвёўшы позіркам жанчыну, адказаў:

— Чаму не! Не толькі для Вас, але і для сотні жанчын знойдзем работу. Глядзіце, колькі лесу! Спачатку будзеце галлё падбіраць, а ў далейшым, пілішь навучым. А як Ваша прозвішча?..

— Вайтукевіч Эмілія, з вёскі Загорнікі.

З гэтага дня Эмілія Вайтукевіч прыступіла да работы. Яна была першай жанчынай, якая прышла на ўчастак. Эмілія падбірала ламаччо. Калі яна брала сякеру і няўмела размахвала ёю, мужчыны жартавалі:

— Не, гэта не бабская справа. Гэта табе, галубка, не з гаршкамі ў печы ваявань.

Эмілія Вайтукевіч на жарты адказвала жартамі:

— Я магу і з гаршкамі ваяваць і сякерай не горш за вас буду валодаць. Я з вамі яшчэ паспаборнічаю.

І яна яшчэ больш старанна бралася за работу. Праз некалькі дзён тав. Вайтукевіч звярнуцца з заклікам да жанчын прыйсці на лесарапрацоўку. А ў хуткім часе на ўчастак з вёсак Гожы, Крынічная і іншых пачалі прыходзіць жанчыны. Яны станавіліся на падборку галля, абрубку сучча. Мужчыны пераключаліся на больш працаёмкія работы, як рубка і складка лесу.

Эмілія авалодвае лучковай пілой. Работа на гэтай піле не простая справа. Тут яшчэ не ўсе мужчыны авалодалі лучковай пілой. Першы дзень работа не спарылася: Эмілія вырубіла тры кубаметры. Да нормы аставалася поўкубаметра. На другі дзень яна дала ўжо 4 кубаметры.

Кожны дзень прыносіў новыя перамогі. 21 лістапада Эмілія Вайтукевіч вырубіла 8 кубаметраў. Гэта паказчык лепшых стаханаўцаў-лесарубаў участка. Пасля работы на сходзе абмяркоўвалі пісьмо стаўбцоўскіх лесарубаў і возчыкаў. Тав. Вайтукевіч выступіла з прамовай.

— Наша прамысловасць,—сказала яна,—патрабуе больш паліва. Мы падтрымліваем заклік стаўбцоўскіх лесарубаў, абавязуемся да дня выбараў у мясцовыя Советы выканаць план IV квартала. Я гутарыла з сваімі таварышкамі. Мы рашылі арганізаваць брыгаду жанчын-лесарубаў і абавязуемся сваёй брыгадай у саставе 7 чалавек да 15 снежня вырубіць 600 кубаметраў замест планавых да канца года 235 кубаметраў.

22 лістапада работа ішла па-новаму. Тав. Вайтукевіч была назначана брыгадзірам. Яна навучыла рубцы сваіх таварышак. Па-майстэрску ў яе руках хадзіла лучковая піла. Яе сяброўкі Юліяна Лукашэвіч і Станіслава Равінская працавалі папарачнай пілой. Астатнія жанчыны абсякалі галлё, складвалі палення.

Працавалі дружна. Вечарам рабілі падлік.

— Норма ёсць!—сказаў прыёмшчык.

Дзяўчаты былі задаволены сваёй працай.

— Заўтра дадзім больш. А дзень выбараў — 15 снежня—сустрэнем поўным выкананнем сваіх абавязацельстваў,—заявілі жанчыны-лесарубы.

Г. Лупсякоў.

Брыгадна--вузлавы метад рамонту трактараў

Заканчваюцца сельскагаспадарчыя работы. Большасць трактараў і сельскагаспадарчых машын у машынна-трактарных станцыях нашай вобласці пастаўлены ўжо на рамонт. Машынна-трактарныя станцыі, як напрыклад, Гродненская, Граеўская, Беластоцкая і іншыя поўнасцю нарыхтавалі майстэрні, устанавілі патрэбнае абсталяванне і прыступілі да рамонту трактараў. У гэтых МТС таксама не забылі і аб бытавых умовах трактарыстаў-рамонтнікаў. На час рамонту ў МТС падрыхтаваны інтэрнаты і сталовыя.

Зараз задача заключаецца ў тым, каб своечасова і высокаякасна адрамантаваць трактары і сельскагаспадарчыя машыны. Поспех залежыць ад правільнай арганізацыі працы на рамонце. Практыка работы машынна-трактарных станцый усходніх абласцей паказвае, што там, дзе праводзіцца рамонт асташ чым метадам, сіламі асобных брыгад, якасць рамонту не высокая, зацягваюцца работы. Найбольш перадавым метадам рамонту трактараў у нашых умовах можна лічыць брыгадна-вузлавы метад.

Гэты метад заключаецца ў наступным. У мантажным цэху брыгада, разбітая на 2—3 вузлы па два чалавекі ў кожным, робіць разборку і зборку трактараў, гэта значыць, уводзяць трактар у цэх, здымаюць з яго матор, радыятар, паветраачышчальнік, бакі з арматурай, мыюць усе дэталі і рамантуюць задні мост трактара і шасі. Адразу ж пасля разборкі і мыйкі дэталі ў складаецца дэфектная ведамасць старшым механікам або кантралёрам-механікам. Пасля гэтага матор накіроўваецца для рамонту ў маторны цэх, дзе робіць рамонт шатунна-поршневай групы, галоўкі блока, расточка і прыгонка шатунных і карэнных падшыпнікаў, прырабатка і выпрабаванне матора. У маторным цэху таксама можна арганізаваць 2—3 вузлы па адному чалавеку. Рамонт арматуры— карбюратараў, насосаў, рэгулятараў і т. д. праводзіцца асобным вузлом з колькасцю рабочых 2—3 чалавекі. У медніцкім цэху адзін або два чалавекі рамантуюць радыятары і бакі і два чалавекі заліваюць матарныя падшыпнікі.

Узначальваць работу кожнага вузла павінен брыгадзір. Ён кіруе работай і сочыць за якасцю рамонту. Работай усёй майстэрні кіруе старшы механік, а кантроль і выбракоўку вытварае механік-кантралёр.

Брыгадна-вузлавы метад рамонту павышае зацікаўленасць за якасць работы і павышае кваліфікацыю работнікаў, працуючых на паўных вузлах. Пры вузлавым метадзе эканомна скарыстоўваецца рабочая плошча майстэрань, ліквідуецца неразбярыха і беспарадак, якія бываюць пры скразным брыгадным метадзе рамонту. А галоўнае,—што пры вузлавым метадзе рамонту,—гэта высокую якасць работы.

Брыгадна-вузлавы метад павінен быць шырока прыменены ў кожнай машынна-трактарнай станцыі нашай вобласці.

Н. Сяргееў,
інжынер аблземаддзела.

Падрыхтоўка да выбараў у мясцовыя Советы

Агітаваць ярка, даходліва і канкрэтна

Вясковы агітатар Іосіф Внароўскі

У вёсцы Дрангі, Сакольскага сельсовета, Лапскага раёна, 87 выбаршчыкаў. Яны ахвотна збіраюцца кожны раз у памяшканні школы, каб паслухаць агітатара.

Працуе два гурткі. Першым гуртком кіруе малады сялянскі хлопец Іосіф Внароўскі. Наладжваць заняткі ў гуртку Внароўскаму дапамагае настаўніца Чэслава Краеўская, якая кіруе другім гуртком. Яна дапамагае Внароўскаму складаць планы правядзення заняткаў, падбіраць неабходную літаратуру і дае метадычныя парады, як лепш прыпаднесці матэрыял слухачам. Пачынаюцца заняткі.

Агітатар напамінае слухачам мінулую тэму, задае некалькі пытанняў і пераходзіць да наступнага раздзела Палажэння аб выбарах. Яго ўважліва слухаюць. У канцы сваёй гутаркі агітатар запытаў у слухачоў, ці ўсё ім зразумела.

— Мне не зразумела,—сказаў адзін з найбольш старэйшых выбаршчыкаў.—За колькі кандыдатаў у дэпутаты я буду галасаваць: у абласны Совет трэба выбіраць ад нашага раёна 4 дэпутатаў, у раённы—54, ды яшчэ ў сельскі Совет...

Внароўскі хацеў адказаць сам, але заўважыў нецярплівы погляд аднаго выбаршчыка, які сядзеў у трэцім раду. Напэўна ён жадае адказаць на пытанне старога,—падумаў агітатар і дазволіў яму гаварыць.

— Выбаршчык атрымае на рукі тры бюлетэні. У кожным з іх будзе запісана прозвішча аднаго кандыдата, вылучанага па адпаведнай выбарчай акрузе ў абласны, раённы і сельскі Советы. Значыць, выбіраць будзем трох кандыдатаў. Усе астатнія кандыдаты ў дэпутаты мясцовых Советаў будуць выбірацца ў іншых акругах, там, дзе яны вылучаны.

Стары задаволіўся адказам.

Заняткі скончаны. Аднак пайшло толькі тры чалавекі, астатнія сядзяць, чагосьці чакаюць.

— Можа быць, раскажаце нам што-небудзь аб калгасах,—нясмела папрасіў адзін селянін.

— Во, во, аб калгасах!—падтрымалі другія.

Агітатар меў пры сабе газету з матэрыяламі аб калгасах. Мясцовыя факты і прыклады падыходзяць для гэтай тэмы. І ён адшукаў раённую газету з артыкулам аб размеркаванні даходаў у калгасе «8 сакавіка», суседнята, Пасвентанаўскага сельскага Совета.

Ён чытаў сваім аднавяскоўцам аб дружнай рабоце калгаснікаў — былых батракоў і беднякоў, аб вялікіх даходах, якія яны цяпер атрымліваюць. Калі агітатар дачытаў да таго месца, дзе гаварылася аб калгасніку т. Пліхта, які атрымлівае каля 60 цэнтнераў зернавых, у тым ліку 9 цэнтнераў адной пшаніцы, 180 цэнтнераў бульбы і іншыя прадукты, а таксама грошы, то многія кінулі рэплікі:

— Вось гэта здорава!

— І дзе толькі людзі будуць дзяваць столькі дабра?

— Што тут дзіўнага? Ім і машыны і ўгнаенні адпускаюць.

— А табе хто перашкаджае атрымліваць машыны і ўгнаенне? У калгас трэба аб'яднацца, інакш якжа ты скарыстаеш гэтыя машыны?

Агітатар уважліва прыслухоўваўся да выказванняў.

— Ці патрэбна мне выступіць?—падумаў ён.—Не, не трэба. Сялянам усё ясна.

Калі ўсе супакоіліся, Херанім Снегоўскі папрасіў слова.

— Мяне вось цікавіць наконт службы ў Чырвонай Арміі?

Ён з дня на дзень з нецярплівасцю чакаў выкліку яго ў райваенкамат для адпраўкі ў часць. А таму Снегоўскі жадаў паслухаць аб Чырвонай Арміі, баявой вучобе, жыцці чырвонаармейцаў.

Внароўскі пачаў нешта шукаць сярод брашур і спыткаў і, знайшоўшы лісток, сказаў:

— Гэта, таварышы, копія пісьма Рацыборскага, сына таго Рацыборскага з вёскі Трускалясы — Ольшына, якога вы ўсе ведаеце. Яго сын нядаўна прызван у Чырвоную Армію і адпраўлен у танкавую часць. І вось што ён піша. Агітатар прачытаў з пачатку і да канца пісьмо маладога чырвонаармейца. Той пісаў аб ветлівасці камандзіраў, добрым харчаванні, спорце і мастацкай самадзейнасці чырвонаармейцаў, аб цікавай баявой вучобе.

Пісьмо зрабіла вялікае ўражанне. Агітатар Іосіф Внароўскі па просьбе слухачоў прыняўся за чытку і растлумачванне тэлеграм з-за граніцы.

Заняткі працягваліся.

Нік. Ражкоў.

Прадвыбарчая агітацыя ў Чыжаўскім раёне

У сувязі з надыходзячымі выбарамі ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных у Чыжаўскім раёне разгорнута вялікая агітацыйна-масавая работа. Арганізавана 19 агіткалектываў. Кіраўнікамі агіткалектываў зацверджаны кіруючыя работнікі раёна. Арганізавана 588 гурткоў. Падабрана і зацверджана 735 агітатараў, у тым ліку 568 чалавек з мясцовага актыва. Агітатары праводзяць вялікую работу па вывучэнню Палажэння аб выбарах і Сталінскай Канстытуцыі. Уся работа праводзіцца на польскай мове. 13.115 чалавек выбаршчыкаў у раёне ахоплены агітмасавай работай.

Добра арганізавана агітработа ў Каленчыцкім сельсовеце. Агіткалектывам кіруе тав. Бельскі, сакратар райвыканкома. У сельсовеце арганізавана 19 гурткоў. 29 агітатараў з мясцовага актыва праводзяць агітмасавую работу сярод насельніцтва.

У гуртку, дзе агітатарам тав. Руткоўскі, займаюцца 36 чалавек. Тав. Руткоўскі добрасумленна рыхтуецца да заняткаў, і таму яны праходзяць цікава. Выбаршчыкі добра ведаюць сваіх кандыдатаў у дэпутаты абласнога, раённага і сельскіх Советаў дэпутатаў працоўных, добра ведаюць Сталінскую Канстытуцыю і Палажэнне аб выбарах, уважліва чытаюць газеты.

Агіткалектывам у Дамброўскім сельсовеце кіруе тав. Бандарэнка. Ён правёў тры семінары з агітатарамі. Агітатары праводзяць работу сярод 1.120 выбаршчыкаў. Агітатары тт. Грабоўскі Юзеф, Ядвіга Выпынская, Ігнат Герантаўскі, Казімір Вайно і Стэфан Ляшчук правялі па 5 заняткаў, вывучылі з выбаршчыкамі Палажэнне і Канстытуцыю, арганізоўваюць галосную чытку газет, вядуць акуратны ўлік заняткаў і наведванняў.

Добра пастаўлена работа агіткалектываў Расахацкага, Есініцкага і іншых сельсоветаў. Заслугоўвае ўвагі работа агітатара тав. Недзескай—настаўніцы-полькі. У верасні гэтага года ў вёсцы Дамброва, Есініцкага сельсовета, яна арганізавала гурток. За гэты час ёю праведзена 7 заняткаў.

Многа агітатараў выконваюць чэсна і аддана сваю пачотную работу. Але ёсць у раёне агіткалектывы, якія яшчэ не разгарнулі агітацыйна-масавую работу сярод выбаршчыкаў. Гэта адносіцца да агіткалектыва Андрэеўскага сельсовета (кіраўнік тав. Дубоўка, сакратар райкома комсамола). З 20 гурткоў працуюць толькі 13. Работа з агітатарамі не праводзіцца. Тав. Дубоўка не забяспечыла агітатараў неабходнай выбарчай літаратурай. Яна нагат не склала плана работы агіткалектыва.

Дрэнна працуе агіткалектыў у Папарацкім сельсовеце. Не арганізавана работа агіткалектыва ў раённым цэнтры — Чыжаве. Кіраўнік агіткалектыва, загадчык парткабінета тав. Грэбянчук не праводзіць пастаяннай работы з агітатарамі.

Пачотная задача агітатараў — ахапіць агітацыйнай работай усіх выбаршчыкаў.

С. Сенцюроў.

Выбарчы ўчастак—цэнтр агітмасавай работы


Выбарчы ўчастак № 4 з дня свайго ўтварэння стаў цэнтрам агітмасавай работы сярод выбаршчыкаў.

Зараз на ўчастку працуе 24 агітатары, якія вывучаюць з выбаршчыкамі Канстытуцыю і Палажэнне аб выбарах. Заняткі праводзяцца рэгулярна. Выбаршчыкі праяўляюць вялікую актыўнасць. Агітатарамі Васфатарам, Сабалеўскім, Скваронскім, Даронінай, Новікавай праведзена ўжо па 3—4 заняткаў, на якіх прысутнічала па 30—40 чалавек. Гурткамі ахоплена 998 чалавек.

Вялікую палітмасавую работу сярод выбаршчыкаў праводзяць старшыні і члены акруговых выбарчых камісій. Старшыня акруговай выбарчай камісіі № 16 па выбарах у гарадскі Совет тав. Мацейка, старшыня акруговай выбарчай камісіі № 18 Анна Янчанка і іншыя растлумачваюць выбаршчыкам незразумелыя пытанні, якія ўзнікаюць у іх.

Мароз.

Граева.



У Мінскім акруговым Доме Чырвонай Арміі імені К. Е. Варашылава працуюць курсы па падрыхтоўцы ў ваенныя акадэміі.

На здымку: на занятках у кабінеце фізічнай геаграфіі. Злева (стаіць) выкладчык А. Т. Мухін.

Фота І. Шышко. Фотахроніка БЕЛТА.

Фізічная культура—справа кожнага комсамольца

Фізічная культура ў СССР ёсць справа першаступеннай дзяржаўнай важнасці. Асаблівая адказнасць за разгортванне масава-фізкультурнай работы ўскладаецца на комсамольскія арганізацыі. Кожны комсамолец павінен быць актыўным фізкультурнікам, застрэльшчыкам у рабоце фізкультурных арганізацый. Прыцягнуць да заняткаў фізкультуры ўсіх комсамольцаў, усю моладзь—такая баявая задача стаіць перад комсамолам. Аб гэтым яскрава падкрэслена ў рашэнні ЦК ВЛКСМ аб пастаноўцы фізкультурнай работы сярод комсамольцаў.

Аднак, у нашай вобласці комсамолам у гэтай важнейшай справе мала што зроблена. Зусім недапушчальным з'яўляецца той факт, што з 9 тысяч фізкультурнікаў у вобласці толькі 140 комсамольцаў. Некаторыя райкомы комсамола ўхіліліся ад фізкультурнага руху.

Комсамолец-актывіст павінен быць баявым, сапраўды маладым—і духам і целам. Актывісту-комсамольцу сорамна не ўмець хадзіць на лыжах, адставаць у доўгім пешым пераходзе, дрэнна страляць і скардзіцца на слабую вынослівасць і фізічную нетрэніраванасць. Нашы актывісты-комсамольцы вельмі часта спасылаюцца на адсутнасць часу. Гэта асабліва натлядаецца ў Беластоку, дзе комсамольскі актыў нічым не праяўляе сябе ў фізкультурным руху.

Вялікую ролю ў развіцці фізкультуры іграюць масавыя спартыўныя спаборніцтвы. Пры ўмелай, цікавай арганізацыі гэтых спаборніцтваў многа моладзі далучыцца да фізкультурных арганізацый. Пачаць можна з арганізацыі ў калгасах і на прадпрыемствах спартыўных каманд і секцый па валейболу, футболу, гімнастыцы і т. д.

Правядзенне добра падрыхтаваных ваенізіраваных паходаў, масавых кросаў будзе з'яўляцца пачаткам прыцягнення ўсёй моладзі да фізкультурнай арганізацыі. Але-ж ваенізіраваны паход павінен заўсёды арганізоўвацца пры строга пастаўленай задачы, з абавязковым прымяненнем маскіроўкі і назірання.

У радзе раёнаў і гарадоў паходы праводзіліся, але неабходна яшчэ вялікая крапатлівая работа над тым, каб яны праходзілі больш арганізавана.

У Гродне праведзен мотапрабег па маршруту Гродна—Індуры. Удзельнічала 11 матацыклістаў. У Замбраве, Парэчны і іншых раёнах праведзены паходы па трэніроўцы ў хадзьбе на адлегласць.

Рашэнні XI пленума ЦК ВЛКСМ унеслі карэнныя змяненні ў дзейнасць комсамольскіх арганізацый. Замест існаваўшых ваенных аддзелаў пры райкомах і гаркомах комсамола створаны камісіі па ваенна-фізкультурнай рабоце. Ваенна-фізкультурныя камісіі павінны сур'ёзна заняцца пытаннямі ўдзелу комсамольцаў у абаронна-фізкультурных арганізацыях.

Большасць камісій у гаркомах і райкомах нашай вобласці да апошняга часу не прыступілі да работы. Між тым, з падрыхтоўкай да зімняга спартыўнага сезону справа абстаіць дрэнна. Камісіі абавязаны паклапаціцца аб тым, каб у бліжэйшы час у кожным фізкультурным калектыве былі прыведзены ў парадак лыжныя базы, спартыўны інвентар. Трэба не толькі праверыць становішча, але і дапамагчы ліквідаваць недахопы.

З наступленнем зімы галоўную ўвагу трэба ўдзяліць лыжнаму спорту. Часцей праводзіць лыжныя паходы, ваенныя гульні, масавыя катанні з гор. Трэба не проста вучыць моладзь хадзіць на лыжах, а дабівацца, каб лыжнік умеў праходзіць адлегласць, кідаць гранату, не знімаючы лыж. Справа ідзе аб тым, каб заняткі лыжным спортам праводзіць ва ўмовах, максімальна набліжаных да баявых умоў. Трэба стварыць канькабежныя, хакейныя секцыі.

Пабудова каткоў і ледзяных горак, фізічнае выхаванне школьнікаў, паўсядзённае кіраўніцтва фізкультурнымі калектывамі сяла—усё гэта павінна знайсці поўнае адлюстраванне ў дзейнасці ваенна-фізкультурных камісій.

Ваенна-фізкультурным камісіям таксама адведзена вялікая роля ў перабудове ваеннага абучэння членаў Асоавіяхіма. Неабходна дапамагчы асоавіяхімаўскім арганізацыям стварыць вучэбныя групы, каманды і атрады, падабраць камандны састаў, арганізаваць сістэматычныя заняткі.

Ваенна-фізкультурным камісіям даверан велізарны і адказны ўчастак работы! І справяцца яны з ім толькі апіраючыся на шырокі актыў комсамольцаў, асоавіяхімаўцаў, фізкультурнікаў.

Выкладанне ваеннай справы і заняткі па фізкультуры ў школах павінны праходзіць пры высокай арганізаванасці і стопроцантнай прысутнасці вучняў. Трэба хутчэй і поўнасцю зжыць погляд на ўрок фізкультуры, як на другаступеннае. Чэсць кожнай комсамольскай арганізацыі—змагацца за поўнацэнны ваенна-фізкультурны ўрок, за выкананне праграмы ваеннага вучэння.

Смелых, вынослівых, моцных целам і духам людзей — вось каго павінны расціць нашы спартыўныя арганізацыі.

Г. Рычкоў,
загадчык ваенна-фізкультурным аддзелам абкома ЛКСМБ.



Кіраўнік агіткалектыва 6-га Навагрудскага выбарчага ўчастка дырэктар польскай сярэдняй школы Ф. З. Баржэмскі праводзіць семінар агітатараў.

Фота В. Лупейка. Фотахроніка БЕЛТА.

КУЛЬТУРНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ ВЫБАРШЧЫКАЎ

Вялікім поспехам і папулярнасцю ў чыгуначнікаў і выбаршчыкаў станцыі Беласток карыстаюцца гурткі мастацкай самадзейнасці пры чыгуначным клубе. Сярод гурткоўцаў многа работнікаў чыгуначнага вузла і хатнія гаспадыні.

Асабліва актыўна ўдзельнічае ў выбарчай кампаніі арганізатар самадзейнасці, хатняя гаспадыня Мар'я Адамаўна Сеўрук, кандыдат у дэпутаты гарадского Совета.

Удзельнікі ансамбля песні і пляскі пад кіраўніцтвам тав. Анісімава арганізавалі культурнае абслугоўванне выбаршчыкаў. Для чыгуначнікаў — выбаршчыкаў і агітатараў вузла гурткоўцы ўжо далі 4 канцэрты. Удзельнікаў ансамбля харавога і струннага гурткоў усюды сустракаюць гасцінна.

У бліжэйшы час гурткі мастацкай самадзейнасці выступяць перад выбаршчыкамі рада выбарчых участкаў.

А. Кандрацьеў.

У блакнот агітатару

ЯК ПІЛСУДЧЫКІ ВЯЛІ „АГІТАЦЫЮ" ЗА КАНДЫДАТАЎ У ДЭПУТАТЫ

(Па матэрыялах архіва)

Пасля перавароту Пілсудскага ў 1926 годзе, які быў зроблен з дапамогай англійскіх імперыялістаў, правы народных мас Польшчы яшчэ больш былі абмежаваны. Газета пэпээсаўцаў «Работнік» пісала: «Пілсудскі ідзе з дэмакратыяй і дэмакратыя прыходзіць з Пілсудскім».

Але гэта «дэмакратыя» ліквідавала нават і тыя правы, якія былі запісаны ў польскай канстытуцыі, прынятай у 1921 годзе. Капіталісты, банкіры, памешчыкі пераварот Пілсудскага сустрэлі з вялікім захапленнем. Яны з рук Пілсудскага атрымалі ў канцы 1926 года вялікія крэдыты на выгадных умовах, вясковае кулацтва атрымала магчымасць грабіць сялянскія масы.

Пілсудскі з усёй сілай ката прыняўся за падаўленне рэвалюцыйных выступленняў рабочых і сялян, якія адбываліся па ўсёй Польшчы ў 1926—27 гг. У 1928 годзе тэрор супроць рэвалюцыйнага руху павялічыўся. У гэтых умовах патрабаваўся новы метад правядзення выбараў у сейм, бо рабочыя і сяляне зразумелі, што азначае дыктатура Пілсудскага. Для гэтага ў 1928 годзе Пілсудскім быў арганізаван так званы беспартыйны блок супрацоўніцтва з урадам. На чале гэтага блока сталі прадстаўнікі з лагера пілсудчыкаў. Пілсудскі, стварыўшы беспартыйны блок, паставіў пэўную задачу—забяспечыць шляхам гвалту, подкупу, ашуканства, тэрору выбары ў сейм верных яму староннікаў. Гэты блок стаў актыўна агітаваць сярод насельніцтва за сваіх кандыдатаў па спіску № 1. Спісак № 1 быў распаўсюджан па ўсяму Беластоцкаму ваяводству. Сяляне вёскі Драгашэва, Ломжынскага павета, спецыяльна звярнуліся ў міністэрства ўнутраных спраў, каб ім растлумачылі, за які спісак яны павінны галасаваць і што сабой прадстаўляе спісак № 1. У сваім пісьме ад 3-га лютага 1928 года яны пішуць:

«Мы, жыхары вышэй указанай вёскі, звяртаемся з просьбай да пана міністра растлумачыць нам благасклонна бедным і несвядомым сялянам, як і за які спісак мы павінны аддаць свае галасы, каб наша зямля расла і развівалася і каб, нарэшце, панавала сапраўдная дэмакратыя.

Мы—народ—ужо некалькі разоў былі абмануты, у час мінулых выбараў аддавалі свае галасы несвядома за ворагаў дэмакратыі. Таму не жадаем быць абманутымі трэці раз».

Адказваючы на гэты зварот сялян, беластоцкі ваявода, згодна ўказанняў міністэрства ўнутраных спраў, паведаміў:

«Спісак № 1 беспартыйнага блока супрацоўніцтва з урадам мае падтрымку маршала Пілсудскага, і таму кожны чэсны грамадзянін дзяржавы павінен аддаць свой голас за спісак № 1».

Напярэдадні выбараў у сейм згодна ўказанняў міністэрства ўнутраных спраў, склікаецца Беластоцкім ваяводствам у горадзе Беластоку з'езд «кіраўнікоў» валасцей. На гэтым з'ездзе абмяркоўвалася пытанне аб садзейнічанні адміністрацыйных улад правесці перадвыбарчую агітацыю ў карысць урадавага спіска № 1. Тут былі даны таксама ўказанні мясцовым уладам аб прымяненні раду гвалтоўных мер па часці агітацыі за спісак № 1.

З'езды таксама праходзілі ў кожнай воласці Беластоцкага ваяводства. На іх прысутнічалі не толькі валасныя старшыні і сельскія старасты, але і ўсе мясцовыя кіраўнікі польскай паліцыі. На гэтых з'ездах даваліся прамыя ўказанні, як павінны «працаваць» у перадвыбарчай кампаніі мясцовыя валасныя старасты, паліцэйскія, і ў строга сакрэтным парадку ўказвалася:

«Правесці агітацыю сярод насельніцтва ў карысць таго-ж спіска № 1. У адносінах супраціўляючыхся прымяняць рэпрэсіі пры дапамозе складання пратаколаў. На служачых, якія не згаджаюцца з намі ў сваіх палітычных пераканаўнях, пісаць даняcенні вышэйшым уладам».

Гэты дакумент паказвае, што з сябе прадстаўляла так званая «агітацыя», і раскрывае змест выбараў, якія праводзіліся на «дэмакратычных» пачатках, у панскай Польшчы.

Аднак, не гледзячы на ўсе мерапрыемствы з боку мясцовых улад, «на тэрыторыі Свіслачы—гаворыцца ў справаздачы старасты—пасля абвяшчэння спіска кандыдатаў беспартыйнага блока супрацоўніцтва з урадам насельніцтва выразіла недавер'е».

Міністэрствам унутраных спраў было разаслана на месцы сакрэтнае цыркулярнае распараджэнне, дзе гаварылася аб неабходнасці шырока выкарыстаць для перадвыбарчай агітацыі касцёлы і іншыя богаслужэбныя месцы (мелася на ўвазе, што ў касцёлах лягчэй абмануць працоўныя масы). Аднак гэта не заўсёды ўдавалася. Аб гэтым гаворыць наступны факт. У час богаслужэння ў касцёле ў Цішках 14 лютага 1928 года арганізаваны мітынг ксяндзом быў правалены прысутнымі. Па гэтаму поваду з стараства ў адрас Беластоцкага ваяводства паступіла наступнае паведамленне:

«Прысутнічала на мітынгу 300 чалавек. У момант адкрыцця мітынга ксяндзом сярод прысутных раздаліся крыкі: «Ксёндз павінен берагчы касцёл; касцёл валіцца» і іншыя іранічныя выкрыкі. У зале раздаліся крыкі і свіст, якія не далі гаварыць ксяндзу. Дзякуючы варожаму настрою прысутных, мітынг не адбыўся».

Ф. Александраў.

Комсамольскія актывісты авалодваюць фізкультурнай справай

КНЫШЫН. **(Ад нашага карэспандэнта).** Кнышынскі райком комсамола за апошні час значна палепшыў работу па фізічнаму выхаванню актыва. Ваенна-фізкультурная камісія райкома комсамола распрацавала мерапрыемствы па правядзенню здачы норм на значок «ГПА» (Гатоў да працы і абароны) усімі актывістамі арганізацыі.

Днямі адбыліся першыя заняткі комсамольцаў-фізкультурнікаў, на якіх здаваліся нормы па гранатаметанню, бегу на 1.000 метраў і па веласіпеду. На занятках прысутнічала 29 чалавек. Выдатныя вынікі па гранатаметанню паказаў сакратар пярвічнай арганізацыі пры райкоме ЛКСМБ тав. Дарашчэнка. Ён метнуў гранату на 61 метр. Таксама здалі залікі па гранатаметанню тт. Ракоўскі, Тухто і Нероеў.

У бегу на 1.000 метраў удзельнічала 25 чалавек. Лепшыя рэзультаты паказалі тт. Ракоўскі, Тухто і іншыя. З комсамолак у забегу на 500 метраў першымі прышлі да фініша тт. Філімоненкава і Розенберг.

У бліжэйшыя дні адбудуцца паўторныя заняткі па здачы норм на значок «Гатоў да працы і абароны» актывам раённай комсамольскай арганізацыі.

В. Гарбанёў.

У АПОШНЮЮ ГАДЗІНУ

АФІЦЫЯЛЬНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ ЗАБОЙСТВЕ МАДЖЭАРУ і ЮРГА

БУХАРЭСТ, 29 лістапада. (ТАСС). Румынскае тэлеграфнае агенцтва перадае наступнае афіцыяльнае паведамленне совета міністраў Румыніі: «26 лістапада былы міністр Віржыл Маджэару быў увезен невядомымі з яго дома. У 15 гадзін 30 мінут яго бездыханнае цела, прастрэленае рэвальвернымі кулямі, было знойдзена ў лесе каля Бухарэста.

Прафесар Нікалай Іорга быў увезен з свайго дома ў Сінайе ўвечары 27 лістапада. Спешныя меры, прадпрынятыя ўладамі на працягу ночы для адшукання і вызвалення былога прэм'ер-міністра, засталіся безрэзультатнымі. Раніцой 28 лістапада жандары знайшлі бездыханнае цела Іорга ў вёсцы Стрэшнік у раёне Прахова, прастрэленае шэсцю рэвальвернымі кулямі.

Урад шукае віноўных, якія панясуць суровае пакаранне ў адпаведнасці з увайшоўшым у моц законам».


ІТАЛЬЯНСКАЕ АБВЯРЖЭННЕ

РЫМ, 29 лістапада. (ТАСС). Агенцтва Стэфані перадае, што «аўтарытэтныя кругі абвяргаюць распаўсюджанае замежным агенцтвам певедамленне, пазбаўленае ўсякіх падстаў, згодна якому грэчаскія войскі быццам-бы занялі Аргірокастрон. Аўтарытэтныя кругі абвяргаюць таксама распаўсюджанае лонданскім радыё паведамленне аб тым, што маршал Бадольо быццам-бы адправіўся ў Албанію для таго, каб асабіста прыняць на сябе камандаванне дзеючымі там войскамі. Маршал Бадольо не выязджаў у Албанію. Генерал Соду па-ранейшаму з'яўляецца галоўнакамандуючым войск, якія змагаюцца ў Албаніі».

Спрэчкі ў англійскай палаце абшчын

ЛОНДАН, 28 лістапада. (ТАСС). Учора ў англійскай палаце абшчын адбыліся спрэчкі па пытанню аб становішчы ваеннай вытворчасці ў Англіі. У час гэтых спрэчак члены палаты выражалі сур'ёзнае незадаволенне існуючым становішчам рэчаў. Адкрыўшы спрэчкі, лейбарыст Шынуэл заявіў, што існуючае становішча безумоўна выклікае непакой. Далей Шынуэл указаў, што ў страты англійскага флота і флота саюзнікаў, якія складаюць 2,5 мільёны тон, не ўключаны страты бельгійскага і галандскага гандлёвых флотаў, з улікам якіх агульныя страты складуць звыш 3 мільёнаў тон. Аднак нават гэтыя лічбы не даюць поўнай карціны, бо выбыла з строю многа суднаў вадазмяшчэннем у 5—6 тысяч тон, якія з'яўляюцца асноўным ядром англійскага гандлёвага флота.

Адказваючы на пытанні, узнятыя ў спрэчках, міністр без партфеля Грынвуд заявіў, што хоць становішча ваеннай вытворчасці не можа лічыцца ўпаўне здавальняючым, яно тым не менш не так змрочна, як было прадстаўлена ў спрэчках. Урон, прычынены англійскай прамысловасці, непакоіць і будзе непакоіць англійскі ўрад, але размеры ваеннай вытворчасці фактычна не закрануты. Грынвуд прызнаў таксама, што англійскі гандлёвы флот нясе цяжкія страты. Праграма будаўніцтва гандлёвых суднаў не поўнасцю была выканана, але яна не далёка ад завяршэння, аб'ем вытворчасці ў будаўнічай прамысловасці павялічыўся на 50 процантаў. Цяжкасці Англіі, заявіў Грынвуд, у далейшым будуць узрастаць яшчэ больш.



Артылерыйскія ўмацаванні на паўднёвым узбярэжжы Англіі. Фота-клішэ ТАСС.

АНГЛА-ГЕРМАНСКАЯ ВАЙНА

Германскія паведамленні

БЕРЛІН, 29 лістапада. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае зводку вярхоўнага камандавання германскай арміі.

Германскія эсмінцы прадпрынялі спробу прарвацца к англійскаму ўзбярэжжу праз заходні выхад з Ла-Манша. Пры гэтым завязаўся бой з англійскімі эсмінцамі. Два непрыяцельскіх эсмінцы ўдалося тарпедыраваць. Другія германскія эсмінцы патапілі ля паўднёвага ўзбярэжжа Англіі два параходы вадазмяшчэннем у 9 тысяч і 3 тысячы тон.

У ноч на 28 лістапада і на працягу дня 28 лістапада германская авіяцыя працягвала свае налёты на важныя ў ваенных адносінах аб'екты Лондана. Адзначаны новыя пажары і вялікай сілы ўзрывы.

Пасляховай бамбардыроўцы падвергліся таксама чыгуначныя збудаванні і прамысловыя прадпрыемствы аднаго буйнага горада ў Шатландыі.

У ноч на 29 лістапада некалькі англійскіх самалётаў скінулі фугасныя і запальваючыя бомбы ў Паўночнай і Заходняй Германіі. Некаторыя дамы атрымалі значныя пашкоджанні. За ўчарашні дзень непрыяцель страціў 13 самалётаў. 4 германскіх самалёты прапалі без весткі.

Англійскія паведамленні

ЛОНДАН, 29 лістапада. (ТАСС). Афіцыяльна паведамляецца, што ўчора ўночы германскія самалёты падвергліі інтэнсіўнай бамбардыроўцы раён вусця ракі Мерсей і горад у Паўночна-Заходняй Англіі. У раёне ракі Мерсей узніклі буйныя пажары. Разбурана і пашкоджана многа дамоў. Бомбы былі скінуты таксама ў многіх пунктах паўднёвай часткі Англіі. Матэрыяльны ўрон прычынены бамбардыроўкай, і лік афяр невялікі.

Учора германскія самалёты-знішчальнікі і бамбардыроўшчыкі неаднаразова паяўляліся над графствам Кент і вусцем Тэмзы. Самалёты скінулі некалькі бомб. У адным горадзе графства Кент пашкоджан рад будынкаў. Афяр няма. На працягу дня збіта 5 непрыяцельскіх знішчальнікаў. Англійская авіяцыя страціла 6 самалётаў.

Амерыканскія паведамленні

НЬЮ-ЙОРК, 29 лістапада. (ТАСС). Агенцтва Юнайтэд Прэс паведамляе, што на працягу ўчарашняга дня германскія самалёты лятали над Уэльсам, Сярэдняй Англіяй, Ліверпулем і Паўночна-Усходняй Англіяй. Учора бамбардыроўка англійскіх гарадоў германскімі самалётамі была больш інтэнсіўная, чым за апошнія дні, аднак, як паведамляюць, матэрыяльны ўрон невялікі.

Учора ўночы германскія самалёты амаль безупынна бамбілі харчовыя склады, парты, Саутгемптон, Брыстоль, Ліверпуль, таксама і другія гарады Паўночна-Заходняй Англіі.

Па паведамленню агенцтва Юнайтэд Прэс, учора ўночы і сёння раніцой германскія самалёты звыш 8 гадзін бамбілі горад Ліверпуль. Значны матэрыяльны ўрон прычынен гандлёвым прадпрыемствам, разбурана многа дамоў. Бамбардыроўцы падверглася таксама некалькі гарадоў Паўночна-Заходняй Англіі.

Лонданскі карэспандэнт газеты «Нью-Йорк таймс» перадае, што ўчора ўночы і сёння раніцой англійская сталіца падверглася інтэнсіўнай бамбардыроўцы.

Бамбардыроўка Ліверпуля

БЕРЛІН, 29 лістапада. (ТАСС). Як перадае германскае інфармацыйнае бюро, германскія лётчыкі, звярнуўшыяся з палёту ў Англію, паведамляюць, што Ліверпуль аб'ят пажарам. Атака на Ліверпуль у ноч на 29 лістапада была надта моцнай. Гэты горад з'яўляецца другім па велічыні англійскім портам, буйным цэнтрам забеспячэння Англіі харчаваннем і разнастайнай сыравінай. На вялікім прасторы загарэліся зернасховішчы, сіласныя вежы, маслабойні, сухія докі, нафтасховішчы і авіязаводы, размешчаныя ў раёне ракі Мерсей. Ліверпуль з'яўляецца буйнейшым цэнтрам англійскай ваеннай прамысловасці. Пасля ўдараў, нанесеных Лондану, Брыстолю, Ковентры, Бірмінгаму, Портсмуту і Саутгемптону, германская авіяцыя канцэнтравала свае атакі на важнейшай базе англійскіх астравоў—Ліверпулі.

Рэзультаты бамбардыроўкі Плімута

БЕРЛІН, 28 лістапада. (ТАСС). Як перадае германскае інфармацыйнае бюро, ў Плімуце гараць склады, у якіх маюцца багатыя запасы тавараў. Агнём ахоплены таксама вялікія запасы сыравіны для ваеннамарскога флота Англіі. Установлена, што чыгуначныя збудаванні Вялікай заходняй дарогі значна разбураны. Гэта дарога мае важнае значэнне для сувязі Заходняй Англіі з Лонданам і іншымі гарадамі.

ІТАЛА-ГРЭЧАСКАЯ ВАЙНА

Амерыканскія паведамленні

НЬЮ-ЙОРК, 28 лістапада. (ТАСС). Па паведамленню карэспандэнта агенцтва Юнайтэд Прэс з Струга, грэчаскія войскі занялі Аргірокастрон пасля рукапашных баёў на вуліцах горада, якія прадаўжаліся на працягу гадзіны. Як перадаюць, грэкі страцілі ў баях за Аргірокастрон 157 чалавек забітымі і 300 раненымі. Італьянцы страцілі звыш 300 чалавек забітымі і 500 раненымі.

НЬЮ-ЙОРК, 29 лістапада. (ТАСС). Як перадае агенцтва Юнайтэд Прэс, італьянскія самалёты бамбардыравалі грэчаскія пазіцыі ў гарах Тімор. Грэчаскія і англійскія самалёты бамбардыравалі Валону.

Газета «Нью-Йорк таймс» паведамляе, што італьянцы 28 лістапада ўзмацнілі паветраныя налёты па ўсяму фронту.

Па звестках агенцтва Юнайтэд Прэс, грэчаскія войскі ўзялі ў палон 4 італьянскіх афіцэры і 340 салдат. Узяты два цяжкіх і 3 лёгкіх гарматы, 8 кулямётаў і іншыя ваенныя матэрыялы.

Па паведамленню агенцтва Асошыэйтэд Прэс, грэчаскія і англійскія самалёты на паўднёвым фронце збілі 7 італьянскіх самалётаў. Італьянцы збілі 1 англійскі самалёт. У час боя за Аргірокастрон італьянцы страцілі 3 самалёты. Адзін англійскі самалёт зрабіў вымушаную пасадку.

Італьянцы прадпрынялі моцную контратаку ў сектары Паградзеца. Італьянскія самалёты безупынна бамбардыруюць Флорыну. У горадзе пачаліся вялікія пажары. Вялікі лік жыхароў пакінуў горад. Сур'ёзная сутычка адбылася ўчора, 28 лістапада, на паўднёвы захад ад Паградзеца.

—o—

Адстаўка прэзідэнта Фінляндыі Каліо

ХЕЛЬСІНКІ, 28 лістапада. (ТАСС). Фінляндскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе:

«Прэзідэнт рэспублікі Каліо, які хварэў на працягу многіх месяцаў, падаў у адстаўку. Урад прыняў адстаўку Каліо.

Згодна законапраекта, які будзе прадстаўлен на разгляд сейма, з прычыны выключных абставін, мандаты выбаршчыкаў па выбарах у прэзідэнты ў 1937 годзе будуць прадоўжаны, і выбаршчыкі збяруцца для выбараў новага прэзідэнта, перыяд дзейнасці якога будзе працягвацца да сканчэння тэрміну паўнамоцтваў прэзідэнта Каліо».

„Аптымістычная трагедыя“

(Да пастаноўкі ў Польскім Дзяржаўным тэатры БССР).

Аўтар гэтай п'есы Всевалод Вішнеўскі расказвае нам аб гераічных буднях грамадзянскай вайны.

Сто дваццаць тысяч балтыйскіх і чорнаморскіх маракоў шукалі праўды і знаходзілі яе. Матросы ўсё ідуць і ідуць за Украіну, за партыю, за народ жыццё сваё аддаюць. «Пад сінім небам ідуць, і цішэй становіцца казачы Дон і белы Каўказ». «Свяціла ім сонца, азаралі імёны—Ленін, Сталін, Варашылаў». «Яны пераплылі ўсе рэкі—ад Віслы да Амура» і сумесна з паўстаўшым народам, кіруемыя партыяй большэвікоў, праламілі чэрап контррэвалюцыі.

Перамога на франтах грамадзянскай вайны давалася нялёгка. Маракі-балтыйцы мітынгуюць, без разбору і суда знішчаюць афіцэраў, выбіраюць новае кіраўніцтва. Адным атрадам кіруе анархіст Важак і кулацкі вырадак сіфілітык Сіплы. Моцна яны трымаюць атрад у сваіх лапах. Баяцца маракі Важака. Скрыта негадуюць на яго, а зрабіць нічога не могуць. Дысцыпліна ўпала. Анархія точыць рады рэвалюцыйных войск.

Усе сілы, усю сваю магутную волю напрагае партыя большэвікоў. У гэты анархісцка настроены атрад яна пасылае камісара-жанчыну. У нечалавечых умовах працуе яна. Важак штурхае атрад знішчыць камісара, але куля рэвальвера прасякае гэты злачынны замысел. Матросы ледзь-ледзь супакоіліся. Загадам камандзіра «свабодна-анархарэвалюцыйны атрад» ліквідуецца. Атраду даецца назва «Першага марскога палка». Воляй камісара арганізоўваецца лепшая частка матросаў. Сумесна з імі яна вядзе барацьбу з анархізмам. Ліквідуе варожыя адносіны да былога афіцэра Берынга, цяпер камандзіра палка, прыцягвае на свой бок анархіствуючага Аляксея, але на самай справе прадстаўніка лепшай часткі рэвалюцыйных маракоў. Нарэшце дабіваецца ізаляцыі Важака і яго расстрэлу, прыгавор выконвае яго былы сябра Аляксей. Полк сходзіць з роднага карабля і ідзе ў бой за Советы, за народ.

П'еса скупа паказвае велізарную сілу і волю характара камісара, які ўвасабляе сабой партыю большэвікоў. У гэтым сэнсе характэрна тое, што камісар—жанчына і пры гэтым без імя, прозвішча. Аўтар нібы ўхіляецца ад канкрэтнага чалавека. Вобраз камісара рэалістычны. Але гэта хутчэй тып, чым характар жывога, канкрэтнага чалавека-большэвіка.

Зусім іншае мы заўважаем у абрысоўцы ўсіх астатніх персанажаў п'есы. Асабліва мастацка яркі, сацыяльна глыбокі і пераканаўчы вобраз Аляксея. Гэты характар жывы і індывідуалізіраваны, але ў той-жа час ён тыпізіруе сабой рэвалюцыйных маракоў. Мала таго, ён з'яўляецца зборнікам усяго і станоўчага і ўсяго адмоўнага. Ён ўпорна не верыць у магчымасць таго, што партыя павядзе за сабой сялянства. Ён скептычна адносіцца да рэзультатаў перамогі рэвалюцыі. Але ў той-жа час Аляксей верыць у перамогу, шукае праўды, філасофствуе аб жыцці і верыць сіле і праваце камісараўскай справы. Аўтар праводзіць вобраз ад разгульнага і ўпэўненага староніка анархізма да зусім свядомага змагара з ворагамі рэвалюцыі.

А колькі лірычнай глыбіні, чалавечай цеплыні ў маленькім фіне Вайнонене! Колькі звярынай нянавісці, але і сілы, вытрыманасці ў Важаку! А ён быў калісьці рэвалюцыянерам, быў на катарзе «па аграрных справах». Які агідны Сіплы, то падтрымліваючы Важака, то ў мінуту небяспекі здраджваючы яму. Двудушнічаючы перад камісарам, ён у той-жа час забівае камуніста Вайнонена, адкрывае фронт ворагу. Гэты тып кулацкага вырадка паказвае неабходнасць стражэйшай пільнасці: падобны вораг, які прытаіўся і помсціць, ва ўсякі час можа здрадзіць рэвалюцыі.

«Аптымістычная трагедыя» — п'еса рамантычнага плана. Яна поўна паэзіі, дае прастор фантазіі. Істотнейшай якасцю яе з'яўляецца натхненне. Аўтар выдатна ведае рэчаіснасць. Усе дзеянні людзей, рэалістычныя сітуацыі, атмасферу грамадзянскай вайны ён перажыў сам, пранёс скрозь сваё творчае дыханне і даў нам згустак падзей—манументальны вобраз эпохі. Вельмі паказальна, што аўтара не цікавіць абстаноўка. Ён не апісвае месца дзеяння, не дае многім персанажам іх імён. У п'есе значную ролю іграе падтэкст і аўтарскія адступленні. Таму ў п'есе вялікую ролю павінна іграць музыка. Атмасфера барацьбы і пакут, жахаў і захапленняў, розных багацейшых настрояў, якімі багата п'еса — немыслімы без музыкі.

Несумненна, любы тэатр, які будзе ставіць гэту п'есу, павінен у першую чаргу асвоіць скупы, але надзвычайна выразны тэкст. Гэта ўмова наштурхне яго і на адпаведнае афармленне.

Трагічны аптымізм гэтай п'есы заключаецца ў тым, што камісар воляй партыі большэвікоў арганізавала моцны рэвалюцыйны атрад і кінула яго ў бой супроць ворагаў рэвалюцыі. Полк перамагае, але пагібае камісар. Яго смерць такім чынам сцвярджае жыццё на новых пачатках, калі лёс народа будзе вырашаць сам народ.

Ал. Пакроўскі.

Добрая ініцыятыва

Па ініцыятыве хатніх гаспадынь Тарвіт і Глос у доме № 35 па Совецкай вуліцы (г. Беласток) створана пярвічная арганізацыя Чырвонага Крыжа. Старшынёй выбрана тав. Тарвіт. Арганізацыя паставіла перад сабой пачотную задачу—уцягнуць усіх хатніх гаспадынь, пражываючых у гэтым доме, у арганізацыю Чырвонага Крыжа.

Ф. Г.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

Сёння, 30 лістапада, у 9 гадзін вечара ў Доме настаўніка (Чырвонаармейская, 6) тав. М. Наватрудскім будзе прачытана лекцыя на польскай мове на тэму: «Выбары ў капіталістычных краінах і ў краіне Советаў».

Пажадана з'явіцца ўсім настаўнікам-агітатарам.

Праўленне Дома настаўніка.

Адказны рэдактар Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.

Адрас рэдакцыі: БССР, г. Беласток, будынак аблвыканкома. Тэлефоны: адказнага рэдактара—17-62, адказнага сакратара—49, аддзелаў прапаганды і партыйнага—16-10, эканамічнага аддзела—праз камутатар аблвыканкома, № 23, аддзел пісем—праз камутатар аблвыканкома, № 22. Выдавецтва і бухгалтэрыя—14-32.

УБ—112. Тыраж 12.000 экз. Друкарня Беластокдруку.